# Славутыя імёны Беларусі

## Правапіс вялікай і малой літар у асабовых назвах

# З вялікай літары пішуцца ўсе словы, якія з’яўляюцца:

Імёнамі, імёнамі па бацьку, прозвішчамі

Іван Дамінікавіч Луцэвіч

складанымі прозвішчамі, што пішуцца праз злучок

Дунін-Марцінкевіч, Бялыніцкі-Біруля

псеўданімамі

Мацей Бурачок і Сымон Рэўка з-пад Барысава (Ф. Багушэвіч)

словамі, у якіх засведчаны характэрныя асаблівасці чалавека, яго становішча ў грамадстве, яго якасці:

Еўфрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Усяслаў Чарадзей

**Калі імя, прозвішча стаіць у множным ліку і выступае як НАЗВА РОДУ ці ўжываецца ў значэнні агульнай назвы, то такое слова таксама пішацца з вялікай літары:**

***род Радзівілаў, маёнтак Тышкевічаў, браты Гарэцкія; Нашы продкі — Глебы, Яраславы — сейбітамі дбайнымі былі (У. Скарынкін).***

**ЗАЎВАГА 1.** *Калі* ***ІМЁНЫ****, прозвішчы людзей ужываюцца ў тэксце ў* ***ПЕРАНОСНЫМ ЦІ АГУЛЬНЫМ ЗНАЧЭННІ****, указваючы на рысу характару, паводзіны гэтай асобы, суадносныя з характарам, паводзінамі сусветна вядомых асобаў — сапраўдных носьбітаў гэтых імёнаў, то яны пішуцца* ***з малой літары****:*

***мецэнат, шэрлакі холмсы (дэтэктывы), абаяльныя эдысаны (вынаходнікі).***

**ЗАЎВАГА 2.** ***ІМЁНЫ*** *людзей* ***У МНОЖНЫМ ЛІКУ****, калі іх ўжыванне выяўляе пагардлівыя, зневажальныя адносіны да іх аўтара або яны з'яўляюцца родавымі абазначэннямі, пішуцца* ***з малой літары****:* ***гарлахвацкія, зёлкіны, тулягі, пісулькіны.***

# З малой літары пішуцца ўсе кампаненты:

**ФРАЗЕАЛАГІЗМАЎ**, этымалагічна звязаных з уласнымі назоўнікамі, паколькі такія НАЗОЎНІКІ СТРАЦІЛІ СУВЯЗЬ З КАНКРЭТНАЙ АСОБАЙ ці аб’ектам: *асядлаць пегаса, за царом гарохам, за дзедам шведам, як заблоцкі на мыле, як пілін з канапель, свінтус-грандыёзус* (*пра няўдзячнага чалавека, нахабніка*).

**ПЕРЫФРАЗАЎ**-сінонімаў да псеўданімаў і прозвішчаў: *атаман мужыцкай праўды* (Кастусь Каліноўскі); *заснавальнік беларускай прозы* (Якуб Колас); *госць з высокага неба, паэт чыстай красы* (Максім Багдановіч).



# Хто гэта?

1. **Усходнеславянскі першадрукар, вучоны-энцыклапедыст, медык, батанік, астраном, паэт, асветнік, патрыёт і гуманіст.**

**2. Адзін з выдатных кіраўнікоў і палітыкаў Вялікага Княства Літоўскага, яго вобраз створаны ў паэме Міколы Гусоўскага “Песня пра зубра”:**

***Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна***
***Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы...***





3. Галоўны арганізатар паўстання ў Беларусі і Літве XIX стагоддзя, наладзіў выпуск першай беларускай газеты «Мужыцкая праўда».

4. Пачынальнік новай беларускай літаратуры, які ствараў наш беларускі тэатр і яго рэпертуар.



5. Паэт-рамантык, класік польскай літаратуры, які нарадзіўся ў Навагрудку; шырока звяртаўся да сюжэтаў, вобразаў, матываў беларускага фальклору і міфалогіі.



6. Літаратуразнаўцы называлі яго **госцем з высокага неба, паэтам чыстай красы.**

Вядома, што ён аўтар аднаго прыжыццёвага зборніка «Вянок» і славутых вершаў «Зорка Венера», «Слуцкія ткачыхі», «Маёвая песня».





*7. Хто аўтар карціны «Закаханыя над горадам»?*



8. Першы беларускі касманаўт, вучоны ў галіне тэхнічных навук, двойчы Герой Савецкага Саюза. Ажыццявіў тры палёты ў складзе экіпажаў касмічных караблёў і арбітальных комплексаў.



9. Авіяканструктар, аўтар больш як **50** самалётаў, **30** з якіх былі пабудаваныя і выпрабаваны, родам з горада Глыбокае Віцебскай вобласці, двойчы Герой Сацыялістычнай Працы.

# 10. Хто аўтар карцін «Партызанская мадонна», «Хлябы»?





# АДКАЗЫ

1. Францыск Скарына
2. князь Вітаўт
3. Кастусь Каліноўскі
4. Вінцэнт Іванавіч Дунін-Марцінкевіч
5. Адам Міцкевіч
6. Максім Багдановіч
7. Марк Шагал
8. Пётр Клімук
9. Павел Сухі
10. Міхаіл Савіцкі

Міхаіл Савіцкі – **н**ародны мастак Беларусі (1972), **н**ародны мастак СССР (1983), правадзейны член **АМ** Расіі, акадэмік **Н**ацыянальнай **а**кадэміі **н**авук Беларусі, лаўрэат **Д**зяржаўнай **п**рэміі СССР (1973), **Герой Беларусі** (2006).

Важны аўтабіяграфічны цыкл карцін "Лічбы на сэрцы". Значнае месца ў творчасці мастака займаюць партрэты — "Жаночы партрэт", "Віленскія сустрэчы", "Янка Купала", "Пушкін і Ганчарова", "Дастаеўскі", "Філосафы", "Аўтапартрэт", "А. Пушкін і А. Міцкевіч", партрэты прэзідэнтаў Акадэміі навук Беларусі .